ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 6 (566) | Субота, 25 лютага 1984 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## Пленум ЦК КПБ

21 лютага г. г. адбыўся XVII пленум ЦК Кампартыі Беларусі. Разгледжана пытанне «Вынікі нечарговага лютаўскага (1984 г.) Пленума ЦК КПСС і задачы партыйных арганізацый рэспублікі, якія выцякаюць з палажэнняў і вывадаў, змешчаных у прамове Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша К. У. Чарненкі».

З дакладам выступіў першы сакратар ЦК КП Беларусі М. М. Слюнькоў.

Па абмеркаванаму пытанню прынята пастанова.

## КАНДЫДАТЫ НАРОДА

### Уладзімір Міхайлавіч ГУБАНАЎ

**Наладчык аўтаматаў завода ліцця і нармалей вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш»— кандыдат у дэпутаты Савета Саюза Вярхоўнага Савета СССР па Гомельскай гарадской выбарчай акрузе № 558**



Уладзімір Міхайлавіч Губанаў нарадзіўся ў 1942 годзе ў сяле Фёдараўка Цераклінскага раёна Уральскай вобласці. Рускі. Член КПСС з 1971 года.

Працоўную дзейнасць пачаў у 1956 годзе рабочым экспедыцыі «Белдзяржпраекта». У вытворчым аб'яднанні «Гомсельмаш» працуе з 1958 года слесарам, затым аўтаматчыкам, а з 1982 года — наладчыкам аўтаматаў.

У. М. Губанаў зарэкамендаваў сябе працалюбівым, ініцыятыўным работнікам, сапраўдным майстрам сваёй справы. Адным з першых на заводзе ён перайшоў на шматстаночнае абслугоўванне.

Ударнік камуністычнай працы Уладзімір Міхайлавіч Губанаў горача падтрымаў пачын «Адзінаццатую пяцігодку— за чатыры гады». Свае абавязацельствы паспяхова выконвае. Ён актыўны рацыяналізатар. Толькі ў бягучай пяцігодцы ўкаранёна сем яго прапаноў з эканамічным эфектам больш шасці тысяч рублёў. Свой багаты вопыт, прафесіянальнае майстэрства шчодра перадае маладым рабочым.

У. М. Губанаў праводзіць вялікую выхаваўчую работу ў калектыве прадпрыемства і па месцу жыхарства. З'яўляецца членам партыйнага камітэта завода, намеснікам сакратара партбюро цэха.

За поспехі ў працы і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці У. М. Губанаў узнагароджан ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, удастоен звання лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР.

Уладзімір Міхайлавіч Губанаў — дастойны кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР.

### Вольга Якаўлеўна КАПЫТКА

**Вязальшчыца Гомельскай фабрыкі «8 Сакавіка»— кандыдат у дэпутаты Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР па Гомельскай гарадской выбарчай акрузе № 84**



Вольга Якаўлеўна КАПЫТКА нарадзілася ў 1940 годзе ў с. Красілаўка Наваград-Валынскага раёна Жытомірскай вобласці. Украінка. Член КПСС з 1975 года

Уся працоўная дзейнасць В. Я. Капытка звязана з фабрыкай «8 Сакавіка», дзе яна працуе вязальшчыцай з 1962 года. Нястомная, добрасумленная працаўніца Вольга Якаўлеўна дасканала асвоіла машыны і абсталяванне, па асабістай ініцыятыве перайшла на адстаючы ўчастак. Асабістым прыкладам дапамагае іншым работніцам дабівацца высокіх вынікаў. Пры норме пяць абслугоўвае шэсць машын і ў цяперашні час здае прадукцыю ўжо ў лік чацвёртага квартала бягучага года. Унесла рад каштоўных прапаноў па ўдасканальванню працы і тэхналогіі вытворчасці, ад укаранення якіх атрыман значны эканамічны эфект.

Вольга Якаўлеўна шчодра перадае свой багаты вопыт і майстэрства маладым работніцам, абучыла сваёй прафесіі больш трыццаці чалавек. За актыўны ўдзел у выхаванні маладых рабочых узнагароджана дыпломам Міністэрства лёгкай прамысловасці СССР і ЦК галіновага прафсаюза.

В. Я. Капытка з'яўляецца членам партбюро, старшынёй групы народнага кантролю цэха, прафгрупоргам брыгады. На працягу многіх гадоў праводзіць вялікую выхаваўчую работу ў падшэфнай школе № 10 г. Гомеля.

За высокія працоўныя дасягненні і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці В. Я. Капытка ўзнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, з'яўляецца ўдарнікам дзесятай і адзінаццатай пяцігодак.

Вольга Якаўлеўна Капытка — дастойны кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР.

## ДАСТОЙНАЯ ВЫСОКАГА ДАВЕР'Я

У мінулую пятніцу, 17 лютага ў актавай зале універсітэта адбылася сустрэча выкладчыкаў, студэнтаў, супрацоўнікаў ГДУ з кандыдатам у дэпутаты Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР, вязальшчыцай гомельскай фабрыкі «8 Сакавіка» **Вольгай Якаўлеўнай Капытка.**

Уступным словам сустрэчу адкрыў сакратар парткома ГДУ **М. І. Старавойтаў.** З вялікім уздымам удзельнікі сустрэчы выбралі ганаровы прэзідыум у саставе Палітбюро ЦК КПСС.

Давераная асоба кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР В. Я. Капытка асістэнт кафедры філасофіі **В. І. Шыхуцін** расказаў аб працоўнай і грамадскай дзейнасці Вольгі Якаўлеўны, у якой увасобіліся ўсе лепшыя рысы, уласцівыя савецкаму чалавеку, працаўніку і патрыёту. Дваццаць два гады працуе В. Я. Капытка на фабрыцы «8 Сакавіка» і ўвесь гэты час з'яўляецца прыкладам працалюбства, добрасумленнасці, чэснасці і прынцыповасці для іншых работнікаў, прадпрыемства. В. І. Шыхуцін выказаў упэўненасць у тым, што Вольга Якаўлеўна будзе так жа дастойна выконваць свае дэпутацкія абавязкі, як выконвае сёння працоўныя і грамадскія.

На сустрэчы з кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР выступілі прарэктар па вучэбнай рабоце член-карэспандэнт АН БССР **Л. А. Шамяткоў,** намеснік старшыні прафбюро геалагічнага факультэта **А. С. Кузьміцкая,** сакратар партарганізацыі фізкультурна-аздараўленчага камбіната **Ф. С. Канаш,** загадчык кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства прафесар **П. У. Сцяцко,** брыгадзір матальнага цэха фабрыкі «8 Сакавіка» **В. Ф. Злотнікава,** студэнтка 3-га курса эканамічнага факультэта, ленінская стыпендыятка **І. Даманцэвіч,** асістэнт кафедры оптыкі **А. М. Гадлеўская,** загадчык кафедры галіновых эканомік **А. В. Нявераў.** Усе яны заклікалі выбаршчыкаў 4-га сакавіка аднадушна аддаць свае галасы за дастойнага прадстаўніка рабочага класа Гомельшчыны — В. Я. Капытка.

Выступаўшыя на сустрэчы давалі наказы В. Я. Капытка па хвалюючых і надзённых пытаннях.

Затым слова атрымала Вольга Якаўлеўна. Яна шчыра дзякавала калектыву фабрыкі «8 Сакавіка», які вылучыў яе кандыдатам у дэпутаты вышэйшага органа Савецкай улады, выкладчыкам, студэнтам і супрацоўнікам універсітэта, якія аднадушна падтрымалі яе кандыдатуру па вылучэнню ў дэпутаты Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР па Гомельскай гарадской выбарчай акрузе № 84. В. Я. Капытка запэўніла ўдзельнікаў сустрэчы ў тым, што прыкладзе ўсе сілы, каб выканаць наказы сваіх выбаршчыкаў.

У сустрэчы прынялі ўдзел сакратар Цэнтральнага РК КПБ **В. І. Чэпелаў,** прадстаўнікі калектываў фабрыкі «8 Сакавіка», аўтарэмзавода і фізкультурна - аздараўленчага камбіната.

**(Наш кар.).**

## ПРЫСВЕЧАНЫ ДНЮ САВЕЦКАЙ АРМІІ

21 лютага ў актавай зале універсітэта адбыўся ўрачысты сход выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў, прысвечаны 66-ай гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту.

Сход адкрыў намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце дацэнт кафедры палітэканоміі Г. Д. Ветлугаеў.

З дакладам аб слаўным шляху Узброеных Сіл СССР на сходзе выступіў старшыня камітэта ДТСААФ ГДУ маёр запасу У. А. Коўш.

Начальнік аддзела кадраў П. А. Савінскі апавясціў загад па універсітэту, у якім калектыў ГДУ павіншаваны з Днём Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, а найбольш актыўным ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і лепшым студэнтам па правядзенню ваенна-патрыятычнага выхавання і абаронна-масавай работы аб'яўлена падзяка.

Ва ўрачыстай абстаноўцы дэкану гісторыка-філалагічнага факультэта Т. І.. Язэпавай уручаны пераходны Чырвоны сцяг за лепшыя вынікі, дасягнутыя гістфілам за мінулы год у правядзенні ваенна-патрыятычнай і абаронна-масавай работы. Эканамічнаму і матэматычнаму факультэтам, якія занялі адпаведна 2-е і 3-е месцы, уручаны пераходныя чырвоныя вымпелы і граматы.

Група актывістаў абароннага таварыства ўзнагароджана граматамі камітэта ДТСААФ ГДУ.

Для ўдзельнікаў сходу быў паказаны конкурсны канцэрт фізічнага факультэта.

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, Савет кафедр грамадскіх навук горача віншуюць асістэнта кафедры гісторыі КПСС НЯМКЕВІЧА Ігара Віктаравіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.**

# НАРОШЧВАЦЬ НАВУКОВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

**З даклада прарэктара па навуковай рабоце прафесара М. В. НАВУЧЫЦЕЛЯ на пашыраным Савеце універсітэта, абмеркаваўшага пытанне «Вынікі навукова-даследчай, вучэбнай, вучэбна-метадычнай работы і падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў за 1982—1983 навучальны год».**

Дзейнасць рэктарата, дэканатаў, кафедр па кіраўніцтву НДР у 1982—1983 навучальным годзе была накіравана на рэалізацыю рашэнняў XXVI з'езда КПСС, XXIX з'езда КП Беларусі, лістападаўскага (1982 г.) і чэрвеньскага (1983 г.) Пленумаў ЦК КПСС, пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 6 красавіка 1978 г. «Аб павышэнні эфектыўнасці навукова-даследчай работы ў вышэйшых навучальных установах», прынятай у жніўні 1983 г. пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па паскарэнню навукова-тэхнічнага прагрэсу ў народнай гаспадарцы».

За справаздачны перыяд калектыў універсітэта дабіўся пэўных поспехаў у выкананні аб'ёмаў і павышэнні ўзроўню навуковых даследаванняў, ва ўдасканальванні іх арганізацыі і росце рэзультатыўнасці.

У 1983 годзе НДР універсітэта праводзілася па 10 асноўных навуковых напрамках. Тэматычны план уключыў 86 тэм, у ліку якіх 50 дзяржбюджэтных і 36 гаспдагаворных. Планавалася закончыць 15 тэм, у тым ліку 3 дзяржбюджэтныя і 12 гаспдагаворных. План выканан.

Аснову плана навукова-даследчых работ фарміруе важнейшая тэматыка. У цэлым яе ўдзельная вага ў 1983 г. склала 80,9% (у 1978 г. — 51%, у 1982 г. — 78%).

Паказчыкі навуковых даследаванняў у канцы 1983 г. разглядаліся на ўніверсітэце ў сувязі з падвядзеннем вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва. У галіне НДР сярод факультэтаў 1-е месца заняў фізічны, 2-е — матэматычны, 3-е — эканамічны. Па кафедрах прыродазнаўчага профілю: 1-е месца — радыёфізікі, 2-е — оптыкі, 3-е — МПУ.

Па кафедрах гуманітарнага профілю: 1-е месца — эканомікі працы, 2-е — педагогікі і псіхалогіі, 3-е — беларускай мовы.

У 1983 годзе супрацоўнікамі універсітэта выдадзена 5 манаграфій і 3 падручнікі. Усе гэтыя работы гуманітарнага профілю.

Ва універсітэце выдадзена ратапрынтным спосабам вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры агульным аб'ёмам 80,7 друкаваных аркушаў.

Унутрывузаўскія выданні ў 1983 годзе склалі 45 назваў. Акрамя таго былі выдадзены тэзісы дакладаў IX рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі «Праблемы фізічнага выхавання і спартыўнай падрыхтоўкі студэнцкай моладзі» і тэзісы абласной тэрэтычнай навуковай канферэнцыі «Жывёльны свет Беларускага Палесся, ахова і рацыянальнае выкарыстанне».

Супрацоўнікамі універсітэта апублікавана ў 1983 годзе 162 навуковыя артыкулы, у т. л. у замежных выданнях — 9, ва ўсесаюзных — 77, рэспубліканскіх — 76. Выдадзена тэзісаў: міжнародных канферэнцый — 5, усесаюзных — 1, рэспубліканскіх — 349.

У справаздачным годзе задэпаніраваны 21 рукапіс, у т. л. НДЛ СП — 5, кафедрамі матэматычнага аналізу і гісторыі КПСС — па 2.

Найбольшую колькасць публікацый забяспечылі кафедры: тэарэтычнай фізікі, оптыкі, фізікі цвёрдага цела, НДЛ СП, заалогіі і аховы прыроды.

Рад кафедр у 1983 годзе з улікам дэпаніравання не меў супрацоўнікаў, не апублікаваўшых работ. Гэта, напрыклад, кафедра фізіялогіі чалавека і жывёлін, тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі, заалогіі і аховы прыроды.

Разам з тым нельга не адзначыць, што па некаторых кафедрах колькасць публікацый застаецца нізкай, а рад супрацоўнікаў, уключаючы кандыдатаў навук, дацэнтаў, за справаздачны перыяд нічога не апублікавалі. Вельмі слаба па публікацыях прадстаўлена кафедра гісторыі КПСС.

З кожным годам узрастае роля універсітэцкіх кафедр і лабараторый у распрацоўцы прыкладных навукова-даследчых праблем. Гэта галоўны шлях пашырэння сувязей нашых вучоных з вытворчасцю, нарошчвання намаганняў па аказанню дапамогі вытворчасці. Такога роду дзейнасць ажыццяўляецца на аснове гаспадарчых дагавораў, а таксама на грамадскіх пачатках па лініі заключэння дагавораў аб сацыялістычнай творчай садружнасці.

Гаспдагаворныя работы займаюць вялікае месца ў плане НДР універсітэта. Яны забяспечваюць асноўную крыніцу сродкаў, якія выкарыстоўваюцца для пашырэння матэрыяльнай базы. Па плану НДР універсітэта ў 1983 годзе выконвалася 35 г/д тэм, і з іх 23 завершаны. Планавы аб'ём г/д даследаванняў — 1350 тыс. руб. Фактычнае выкананне склала 1349,1 тыс. руб.

Гаспдагаворныя даследаванні абавязковым вынікам павінны мець укараненне ў вытворчасць з пэўнай эфектыўнасцю. У 1983 годзе планавалася да ўкаранення 26 навукова-даследчых распрацовак. Фактычна ўкаранёна 62 распрацоўкі.

Гадавы эканамічны эфект, атрыманы ў справаздачным годзе галінамі народнай гаспадаркі ад укаранення навуковых распрацовак ГДУ і пацверджаны прадпрыемствамі і арганізацыямі, склаў 2030,5 тыс. руб. Адносны эканамічны эфект на 1 рубель агульных затрат на навуку ў 1983 г. склаў 1,38. Найбольшы эканамічны эфект атрыман кафедрамі фізічнага факультэта — 1145,8 тыс. руб. На другім месцы — матэматычны факультэт (713,3 тыс. руб.), на трэцім — эканамічны (172,4 тыс. руб.).

Пытанні аказання дапамогі вытворчасці набылі асаблівую вастрыню ў сувязі з курсам партыі на ўсямернае паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу. Гэта прадугледжана лістападаўскім (1982 г.) і снежаньскім (1983 г.) Пленумамі ЦК КПСС, пастановай ЦК КПСС і СМ СССР «Аб мерах па паскарэнню навукова-тэхнічнага прагрэсу ў народнай гаспадарцы», студзеньскім (1984 г.) пленумам ЦК КПБ.

Кафедрам неабходна нарошчваць аб'ёмы работ, выконваемых для рэспублікі, вобласці, горада. Гэта пытанне вельмі востра пастаўлена перад універсітэтам у сувязі з абмеркаваннем у снежні мінулага года Камісіяй Савета Міністраў БССР па навукова-тэхнічнаму прагрэсу вопыту работы прамысловасці Гомельскай вобласці па ўмацаванню сувязей з навуковымі ўстановамі і ўкараненню дасягненняў навукі і тэхнікі ў вытворчасць. Камісіяй адзначалася, што ў нашым універсітэце назапашаны пэўны вопыт па навукова-тэхнічнаму супрацоўніцтву з прамысловымі прадпрыемствамі і аб'яднаннямі Гомельшчыны, па рэалізацыі закончаных распрацовак у вытворчасць.

За тры гады 11-й пяцігодкі вучоныя ГДУ закончылі і ўкаранілі на прадпрыемствах г. Гомеля і вобласці 26 распрацовак з эканамічным эфектам 1877,86 тыс. руб.

Па заказах прадпрыемстваў рэспублікі ў 1983 г. выканана 19 гаспдагаворных НДР аб'ёмам 620 тыс. руб., або 45,9% агульнага аб'ёму. На прадпрыемствах БССР укаранёна 16 распрацовак з эканамічным эфектам 338,7 тыс. руб., у тым ліку на прадпрыемствах горада і вобласці адпаведна 6 і 113,9.

У справаздачным годзе ва універсітэце палепшылася вынаходніцкая работа. Узрасла яе эфектыўнасць, Летась атрымана 18 рашэнняў аб выдачы аўтарскіх пасведчанняў, што ў 1,4 разы больш, чым у 1982 годзе.

У параўнанні з 1982 г. у 2 разы павялічылася колькасць укаранёных у народную гаспадарку тэм, выкананых на ўзроўні вынаходніцтваў. Эканамічны эфект ад іх склаў 475,8 тыс. руб. (У 1982 г. эфекту не было).

У мінулым годзе некалькі палепшылася вынаходніцкая работа студэнтаў. Пададзена пяць заявак і атрымана адно станоўчае рашэнне.

Па выніках агляду на лепшую пастаноўку вынаходніцкай і патэнтна-ліцэнзійнай работы першае месца прысуджана праблемнай навукова-даследчай лабараторыі фізіка-хімічных працэсаў трэння, другое — кафедры фізікі цвёрдага цела. Першае месца сярод факультэтаў заняў фізічны факультэт. Лепшымі вынаходнікамі універсітэта прызнаны старшы навуковы супрацоўнік галіновай навукова-даследчай лабараторыі кафедры радыёфізікі В. А. Яцкевіч (пяць рашэнняў аб выдачы пасведчанняў і 12 пададзеных заявак); дацэнт кафедры фізікі цвёрдага цела І. М. Мельнічэнка (4 рашэнні аб выдачы пасведчання і 7 пададзеных заявак) і інш.

Нягледзячы на дасягнутыя поспехі вынаходніцкая і патэнтна-ліцэнзійная работа ГДУ усё яшчэ знаходзіцца на недастатковым узроўні. Застаецца слабай вынаходніцкая актыўнасць і арганізацыя работы на фізічным факультэце. Па сутнасці не вядзецца такая работа на біялагічным, геалагічным факультэтах, факультэце фізвыхавання.

У 1983 г. ва універсітэце праведзена вялікая работа па ўхіленню недахопаў у арганізацыі НДР, выяўленых камісіяй міністэрства кантролю. Шмат зроблена па паляпшэнню выкарыстання навуковага абсталявання на кафедрах і ў лабараторыях. Аднак недахопы ў гэтым важным пытанні ліквідаваны яшчэ не поўнасцю.

Навуковым аддзелам, у адпаведнасці з указаннем Мінвуза БССР, была распрацавана, зацверджана рэктаратам і прынята да выканання мэтавая праграма далейшага разгортвання навуковых даследаванняў. Выкананню гэтай праграмы ва універсітэце надаецца вялікае значэнне. Мэтавая комплексная праграма развіцця НДР з'яўляецца канкрэтнай арганізацыйнай формай рэалізацыі пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па паскарэнню навукова-тэхнічнага прагрэсу ў народнай гаспадарцы».

# ПАТРАБАВАННЯМ

ўдзел у распрацоўцы серыі новых абавязковых і па выбару спецкурсаў і спецсемінараў для студэнтаў, новай тэматыкі курсавых і дыпломных работ.

Асаблівая роля павінна адводзіцца лекцыйным курсам, накіраваным на засваенне прынцыповых пытанняў той ці іншай дысцыпліны. Факультэцкія кафедры, абавязаны перабудоўваць работу так, каб паспяхова рашаць названыя вышэй праблемы. У праекце новага вучэбнага плана ўпершыню прадугледжаны прыкладны пералік дысцыплін спецыялізацыі псіхолага-педагагічнага цыкла.

Вось пералік дысцыплін спецыялізацыі гэтага цыкла: «Методыка выхаваўчай работы», «Узроставая фізіялогія і гігіена», «Змест праграм і падручнікаў па спецыяльнасці для сярэдніх навучальных установаў», «Выразнае чытанне», «Псіхалагічныя метады даследавання асобы і калектыву».

Няма ў нас канкрэтнага падыходу да правядзення некаторых вучэбных практык. Чаму дазваляецца ў нас індывідуальнае праходжанне той ці іншай практыкі некаторым студэнтам? Няўжо толькі таму, што яны ў гэты час працуюць у будатрадах? Гэта пытанне патрабуе ўзгодненых рашэнняў дэканата, кафедр і грамадскіх арганізацый. Дарэчы, як нам вядома, на кафедры беларускай літаратуры сабраны багаты фальклорны рэпертуар, які, на жаль, не даходзіць да чытачоў. А можна было б даўно па прыкладу кафедры беларускай мовы фальклорныя матэрыялы, як і дыялектныя, змяшчаць у міжвузаўскім зборніку «Беларуская літаратура». Даўно настала неабходнасць стварыць на факультэце дыялектна-фальклорную лабараторыю з удзелам у рабоце яе моваведаў і літаратараў з тым, каб і фальклорныя матэрыялы публікаваліся, як і дыялектычныя.

**У. АНІЧЭНКА,**
**загадчык кафедры беларускай мовы, прафесар.**

*Справы інтэрната*

# ЯКІ Ў СТУДЭНЦКІМ ДОМЕ ГАСПАДАР?

Хутка і зусім непрыкметна праляцелі зімовыя канікулы. І вось зноў новыя клопаты: лекцыі, семінары, практычныя. І хаця студэнцкае жыццё шматграннае і напоўненае рознымі падзеямі, але як часам патрэбны нам задушэўныя гутаркі ў студэнцкім інтэрнаце, як добра і прыемна зайсці ў кватэру, дзе пануе чысціня і ўтульнасць.

У нашым інтэрнаце № 3 нам прадстаўлены цэлыя кватэры, і на час вучобы мы становімся іх гаспадарамі. Але паўстае пытанне: якімі парой мы бываем гаспадарамі? Паглядзіце на дзве ружы: адну з іх пастаянна даглядаюць і як вынік — яна прыгожая. І паглядзіце на другую ружу, пра яе забыліся, і яна не цешыць нашых вачэй. Так і нашы пакоі, у якіх мы жывём. Калі ёсць сапраўдны гаспадар, то там заўсёды чыста і ўтульна, а калі мы забываем аб сваіх абавязках, памятаючы толькі свае правы, тады вынік — зусім іншы. З'яўляецца новы «гаспадар» — смецце, і калі не адразу будуць прыняты меры, каб назаўсёды яго правесці з кватэры, цяжкавата бывае тады. Сустракаюцца, канешне, і такія кватэры, куды заходзіць часам і такі «гаспадар». Але апошнія вынікі сацыялістычнага спаборніцтва, падведзеныя ў канцы мінулага года, паказалі, што шмат у нас добрых пакояў, дзе жывуць сапраўдныя гаспадары, здолеўшыя зрабіць так, што дзверы іх кватэр з радасцю адкрываюцца для гасцей і дзе заўсёды пануе ўтульнасць і чысціня.

Першае месца сярод аднапакаёвых кватэр заняла кватэра № 65. Сярод двухпакаёвых — кватэра № 72. Лепшай сярод трохпакаёвых кватэр стала кватэра № 142. Іх жыхары ўзнагароджаны граматамі гісторыка-філалагічнага факультэта і каштоўнымі падарункамі, якія былі ўручаны дэканам факультэта Т. І. Язэпавай.

У сацыялістычным спаборніцтве былі адзначаны наступныя кватэры, дзе таксама заўсёды чыста і ўтульна: №№ 53, 56, 59, 66, 99, 105, 107, 144, жыхары якіх ўзнагароджаны граматамі факультэта і тартамі.

За апошні час члены студсавета правялі рэйды па кватэрах. Вынікі праверак паказалі, што шмат у нас у інтэрнаце добрых пакояў, а пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва апраўдваюць сваё высокае званне. Перад жыхарамі інтэрната № 3 стаіць шмат задач, галоўная з якіх — дабіцца таго, каб у нашым інтэрнаце павялічылася колькасць лепшых пакояў, лепшых гаспадароў. А падвядзе новыя вынікі і выявіць лепшых сацыялістычнае спаборніцтва, якое ўжо пачалося.

**Члены студсавета інтэрната № 3.**

*Прапануе кнігарня*

## ЛІТАРАТУРА ДА ВЫБАРАЎ

Магазін № 19 прапаноўвае літаратуру да выбараў у Вярхоўны Савет СССР.

**Канстытуцыя Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.** М., Юрыдычная літаратура, 1983 г.

**Закон Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік аб выбарах у Вярхоўны Савет СССР.** М. Известия, 1983 г.

**Статут Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.** М., Палітвыдат, 1982 г.

Каментарый да закона аб статусе народных дэпутатаў у СССР, М., Юрыдычная літаратура, 1983 г.

**Ленінскія прынцыпы і метады партыйнага кіраўніцтва.**, М., Палітвыдат, 1983 г.

**ЦІШКЕВІЧ І. С. Асабістая маёмасць грамадзян пад аховай закона.** М., Университетское, 1983 г.

**Е. ГРАБЦЭВІЧ,**
**прадавец магазіна.**

*Па слядах нашых выступленняў*

## МЕРЫ ПРЫНЯТЫ

**У нашай газеце за 24 снежня 1983 года быў надрукаваны матэрыял «Без апетыту». У ім прыводзіліся факты аб недахопах у рабоце сталовых і буфетаў універсітэта, выяўленых у ходзе праверак народнымі кантралёрамі.**

**Як паведаміў рэдакцыі газеты загадчык сталовай № 40 П. І. Дух, названы артыкул разгледжаны на нарадзе работнікаў грамадскіх кропак харчавання. Буфетчыцы Л. Зіновенка, якая скрыла ад рэалізацыі 50 порцый смажанай печані, аб'яўлена вымова з пазбаўленнем за снежань 100 працэнтаў прэміяльнай даплаты.**

**За дапушчаныя недахопы ў сталовай № 86, якая абслугоўвае студэнцкі інтэрнат № 4, заменена загадчыца вытворчасці. Тэхніку-тэхнолагу гэтай сталовай М. Марэнка ўказана на слабы кантроль за якасцю і асартыментам страў.**

**У сталовай № 40 з 24 студзеня для лепшага абслугоўвання наведвальнікаў адкрыта другая абедзенная зала. Для арганізацыі рознічнага гандлю гарачымі напіткамі набыты тэрмасы. Куплены таксама электратытан для ўстаноўкі ў буфеце першага вучэбнага корпуса. У буфеце галоўнага корпуса арганізавана рэалізацыя гарачага чаю.**



**ЗІМА Ў ГОМЕЛЬСКІМ ПАРКУ.**

**Фота С. Коваля, студэнта геалагічнага факультэта.**

*Прырода і ты*

# ГОРАД І ПТУШКІ

На працягу многіх стагоддзяў чалавек глядзеў на прыроду як на невычэрпную крыніцу неабходных для яго матэрыяльных даброт. Але сутыкаючыся з адмоўнымі вынікамі свайго ўздзеяння на прыроду, ён паступова прыходзіў да пераканання ў неабходнасці больш разумнага яе выкарыстання і аховы.

Асаблівую цікавасць прадстаўляюць птушкі горада, таму што працэс урбанізацыі і канцэнтрацыі людзей павялічваецца. Узнікаюць новыя праблемы ўзаемаадносін чалавека і жывой прыроды ўнутры саміх гарадоў.

У сувязі з тым, што для многіх відаў птушак горад стаў свайго роду прыстанішчам— «стадыяй пражывання», ва ўсім свеце назіраецца небывалая па маштабах павелічэнне колькасці такіх птушак як галубы, вераб'і і інш.

На сённяшні дзень, з аднаго боку, патрэбна забяспечыць далейшае павелічэнне відавай разнастайнасці і колькасці птушак у гарадскім ландшафце, з другога — наблізілася неабходнасць абмежаваць колькасць масавых відаў птушак, якія надзвычай размножыліся.

Адно з галоўных месц у гарадской арніталогіі займае ахова і падкормліванне птушак у зімовы перыяд. Састаў зімовай фаўны птушак невялікі. У ёй адсутнічаюць амаль усе віды, звязаныя з вадаёмамі. Рэдкія таксама і драпежнікі, звычайная здабыча якіх адлятае, упадае ў спячку або хаваецца пад снегам (жабы, дробныя млекакормячыя). Зімовыя птушкі кормяцца галоўным чынам расліннай ежай: насеннем, ягадамі, пупышкамі дрэў і г. д. З насякомаедных засталіся толькі нямногія, якія прыстасаваліся да знаходжання схаваўшыхся ў кары дрэў дробных насякомых. Гэта сініцы і дзятлы.

У зімовыя месяцы ў Гомелі налічваецца каля 16 відаў птушак. У снежні было ўлічана 10 відаў птушак. У зоне адчужэння, якая ўключае ўчасткі фарміравання саставаў паяздоў, дзе перавозяць розныя вырабы і сыравіну, харчовыя прадукты ўлічана каля 250 асобін на 10 га. Пераважная большасць з іх — шызы голуб.

Зімовая арнітафауна сучасных мікрараёнаў горада Гомеля хістаецца ад 6 да 9 відаў. У зімовы час характэрны рэгулярныя ранішнія перамяшчэнні галубоў да элеватара, да крупянога і камбікормавага заводаў, канцэнтрацыя іх на чыгуначных пуцях. У раёне элеватара рэгістраваліся зграі галубоў, якія налічваюць больш 2000 асобін. З'ядаючы і забруджваючы зерне, яны прыносяць безумоўную шкоду.

У зімовы час аснову арнітакомплексу складае шызы голуб, дамавы верабей, грак і галка, якія знаходзяць усё неабходнае для паспяховага перанясення неспрыяльных умоў.

А вось многія вельмі карысныя летам птушкі (напрыклад, сініцы) зімой перабіваюцца «з хлеба на ваду». У вялікія маразы іх нямала гіне ад голаду. Зрабіўшы для іх штучныя прыкармліванні, у халодныя і снежныя зімы іх можна выратаваць ад гібелі. Адна загінуўшая зімой самка вялікай сініцы за лета дала б дзесятка паўтара маладых, яшчэ праз год ад якіх атрымалася б патомства каля 100 штук. Гэта ўжо цэлы атрад па барацьбе са шкоднікамі садаводства — дробнымі насякомымі.

У гарадах і ў больш дробных населеных пунктах у халодную пару года можна бачыць іншых зімовых птушак. Асабліва зручным месцам з'яўляюцца паркі, а таксама магільнікі з вялікімі дрэвамі і кустамі. Тут, апрача самых звычайных прадстаўнікоў сямейства варонавых, можна ўбачыць розных дробных сініцчаек, чубатак блакітніц. На розных кустах з ягадамі можна назіраць снягіроў, на вяршалінах дрэў затрымліваюцца вялікія зграі чачотак. З больш буйных птушак у горадзе можна сустрэць вялікага стракатага дзятла.

Кожны від птушак — гэта каштоўны падарунак эвалюцыі. Ад іх аховы і разумнага выкарыстання залежыць дзейнасць чалавека сёння і ў будучым.

**Вялікая відавая разнастайнасць і разумнае павелічэнне колькасці птушак — гэта наша багацце, і абавязак кожнага чалавека заўсёды клапаціцца аб яго памнажэнні.**

**А. КУСЯНКОЎ.**

## СПОРТ

## ПРЫКРАЯ «АСЕЧКА»

У мінулую суботу каля Чонак адбыліся спаборніцтвы па лыжнаму спорту па праграме спартакіяды абласавета «Буравеснік». На старт выйшла каля 200 лыжнікаў. На трохкіламетровай дыстанцыі сярод дзяўчат перамагла лабарантка факультэта фізвыхавання І. Бабохіна. Яе вынік — 13.39. Другое і трэцяе месца занялі адпаведна І. Ждановіч і В. Прыгодзіч з гісторыка-філалагічнага факультэта нашага універсітэта.

Лыжнікі спаборнічалі на пяцікіламетровай дыстанцыі. Пераможцам з вынікам 15.13 стаў студэнт фізічнага факультэта Яўген Запольскі. Студэнты геалагічнага факультэта А. Клімкоў і В. Міхалка занялі адпаведна 2-е і 3-е месцы.

У камандным заліку найбольшую колькасць ачкоў набраў спартыўны клуб ГДУ. Другое месца дасталося СК Гомельскага політэхнічнага інстытута, трэцяе — кааператыўнага інстытута.

Адначасова вёўся залік і па групе факультэтаў. Першынство заваявалі студэнты геалагічнага факультэта нашага універсітэта. Другі радок у турнірнай табліцы занялі студэнты таваразнаўчага факультэта ГКІ. Фізічны факультэт ГДУ — на трэцім месцы.

Выклікае здзіўленне крайне слабае выступленне лыжнікаў факультэта фізвыхавання. Пры 13 выступаўшых камандах яны здолелі заняць усяго толькі восьмае месца. Гэты факт сведчыць аб няўважлівых адносінах на факультэце фізвыхавання да развіцця лыжнага спорту і павышэння майстэрства студэнтаў, якія трэніруюцца ў гэтым відзе.

**(Наш кар.).**

**ДЛЯ ЧЛЕНАЎ САДОВА-АГАРОДНІЦКІХ КААПЕРАТЫВАЎ**

# РАСАДА—ЗАЛОГ УРАДЖАЮ

Бліжэйшыя тыдні і асабліва сакавік, як правіла, самы актыўны час вырошчвання расады гароднінных культур.

Агароднік-аматар можа вырошчваць расадным спосабам практычна ўсе гароднінныя культуры: капусту, памідоры, агуркі, кабачкі, гарбузы, сельдэрэй, цыбулю, перац, баклажаны і інш. Добрая расада — гарантыя атрымання шчодрага ўраджаю ў аптымальныя тэрміны. На працягу першых 20—25 дзён (у фазе сеянцаў) яе можна вырошчваць у пакаёвых умовах на падаконніку, а ў гэты час старанна рыхтаваць цяплічкі або парнікі для растаноўкі перасаджанай у гаршочкі, кубікі або шклянкі расады.

Спосабы атрымання расады разнастайныя. Для гэтага выкарыстоўваюць пажыўныя кубікі і гаршочкі, папяровыя і іншыя шклянкі, напоўненыя загадзя, з восені, або зараз падрыхтаванай урадлівай глебай.

Спачатку насенне высяваюць загушчана, звычайна ў расадныя скрынкі, напоўненыя торфа-перагнойнай глебай. Праз 7—15 дзён пасля з'яўлення ўсходаў, калі расліны сфарміруюць першы сапраўдны лісточак, іх пікіруюць у гаршочкі. Без пікіроўкі можна вырошчваць расаду толькі сельдэрэю, цыбулі і некаторых іншых культур.

Пры наяўнасці парніка на біяпаліве або цяпліцы на вадзяным і іншым тэхнічным абаграванні можна вырошчваць расаду ўсіх культур.

Асаблівую ўвагу трэба ўдзяляць вырошчванню расады памідораў. Адабранае буйнае насенне пратраўліваюць у растворы марганцавакіслага калію (1 г. на паўшклянкі вады пакаёвай тэмпературы). Пратрымаўшы насенне ў растворы 25—30 мінут, яго прамываюць некалькі разоў у чыстай вадзе, пасля замачваюць суткі пры тэмпературы 18—20°, затым загартоўваюць. Для гэтага пасуду з мокрым насеннем, пакладзеным на два слаі марлі, фільтравальнай паперы або прамакаткі, ставяць у халадзільнік, на ляднік, дзе яны знаходзяцца пры тэмпературы ад 0° да —1° (як правіла, ноччу) 12 гадзін. Пасля гэтага на дзень уносяць іх у цёплае памяшканне (пакой) з тэмпературай 18—20°. Паўтараюць гэта на працягу 6 дзён, пасля чаго насенне пакідаюць у цёплым пакоі, дзе яно пачынае хутка даваць расткі. Затым яго сеюць у загадзя падрыхтаваныя скрынкі з зямлёй.

Высяваюць насенне на глыбіню да аднаго сантыметра, адзін ад другога —праз 4 см. Пры з'яўленні першага сапраўднага ліста расаду пікіруюць у гаршочкі, кубікі, шклянкі або ў іншую скрынку з такім жа саставам урадлівай (торфа-перагнойнай зямлі) праз 8 см. Пры гэтым пад кожную расліну пажадана паскласці па некалькі гранул суперфасфату.

Калі круглыя суткі расаду трымаць у цёплым пакоі, то яна атрымаецца выцягнутай, спешчанай. Днём патрэбна тэмпература 18—20°, а ноччу 8—10°. Аматар-агароднік можа цалкам забяспечваць такі рэжым на падаконніку вакна, якое выходзіць на поўдзень або у цёплай кухні, калі на ноч будзе адкрываць фортачку. Раз у два-тры дні паліваюць вадой пакаёвай тэмпературы, а калі расліны развіваюцца слаба, праводзяць падкармліванне мінеральным растворам з разліку 20 г. на 10 л. вады.

Вясной, як толькі тэмпература паветра перавысіць 10° цяпла, скрынкі з расадай пачынаюць выносіць на адкрывае паветра на 3—4 гадзіны. Паступова гэты час павялічваюць.

Расаду агуркоў, кабачкоў, як правіла, вырошчваюць пасевам прарослага насення ў гаршочкі, кубікі або шклянкі.

**В. ВЕРАМЕЙЧЫК,**
**кандыдат сельскагаспадарчых навук, асістэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 56-16-52.

АЗ 51104

Заказ 813.